947.6
А 91

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 947.6“18/19”

**Астрога Валянціна Міхайлаўна**

# ВЯСКОВАЕ НАСТАЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX стст.

07.00.02 – айчынная гісторыя

Аўтарэферат дысертацыі
на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук

**Мінск – 2005**

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар Брыгадзін Пётр Іванавіч, установа адукацыі «Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ», дырэктар

Афіцыйныя апаненты: доктар гістарычных навук, прафесар Іофе Эмануіл Рыгоравіч, установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка», кафедра паліталогіі і права

кандыдат гістарычных навук, дацэнт Самусік Андрэй Фёдаравіч, установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт», кафедра эканамічнай гісторыі

Апаніруючая арганізацыя – установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна»

Абарона адбудзецца 17 сакавіка 2005 г. у 16 гадзін на пасяджэнні савета Д 02.01.05. па абароне дысертацый на суіскание вучонай ступені доктара навук пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (220050, г. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 4, ауд. 334, тэл. вучонага сакратара: 227-45-11).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Аўтарэферат разасланы «14» лютага 2005 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый
кандыдат гістарычных навук, прафесар А.А. Яноўскі

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

***Актуальнасць тэмы дысертацыі.*** Змены, якія адбываюцца ў беларускім грамадстве, ставяць новыя задачы перад школай і ўсёй сістэмай адукацыі. У ліку вядучых умоў сацыяльнага прагрэсу выступае педагагічнае забеспячэнне сацыяльных праграм і планаў, што рэалізуюцца. Сучасная кадравая палітыка ў адукацыі скіроўваецца на яе гуманізацыю і дэмакратызацыю, фарміраванне новай творчай асобы настаўніка, якая займае значнае месца ў сістэме адукацыі нашай рэспубліцы. Як паказаў час, грамадская функцыя настаўніка вельмі вялікая: ён не толькі з'яўляецца транслятарам ведаў, але і персаніфікуе ў сваёй асобе, паводзінах і адносінах з яго акружэннем духоўныя і маральныя каштоўнасці.

Вясковае настаўніцтва, якое складала значную частку інтэлігенцыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст., іграла асобую ролю ў жыцці грамадства. Менавіта ў гэты час, нягледзячы на кансерватыўную палітыку царызму, узнікалі спецыяльныя педагагічныя навучальныя ўстановы. Настаўніцтва стала ўсведамляць сваё месца сярод іншых работнікаў разумовай працы, зрабіла першыя спробы прафесійнага аб'яднання, правядзення сваіх з'ездаў і нарад. Незадаволенае сваім грамадскім статусам, яно пачало барацьбу за паляпшэнне матэрыяльнага і прававога становішча. У гэтай сувязі неабходна асэнсаваць і засвоіць усё пазітыўнае, што было назапашана за палову стагоддзя, не дапусціць на практыцы памылковых падыходаў і рашэнняў у кадравых пытаннях у ходзе сучаснага рэфармавання нацыянальнай сістэмы адукацыі. Асаблівую каштоўнасць уяўляе назапашаны вопыт прафесійнай падрыхтоўкі, а таксама дзейнасць дзяржавы ў вырашэнні кадравага пытання.

Актуальнасць тэмы вызначае і тое, што да цяперашняга моманту не рабіліся спробы спецыяльнага даследавання дадзенай праблематыкі. У гісторыка-педагагічных працах знайшлі сваё адлюстраванне некаторыя агульныя пытанні развіцця пачатковай школы, грамадска-педагагічны рух, урадавая палітыка ў галіне педагагічнай і народнай адукацыі. Як паказаў аналіз літаратуры, у дарэвалюцыйнай і савецкай гістарыяграфіі пераважаў аднабаковы, палітызаваны і ідэалагізаваны падыход да асвятлення гэтай тэмы. Афіцыйна прынятыя шаблоны і догмы ўплывалі на тое, што даследчыкі акцэнтавалі галоўную ўвагу практычна толькі на негатыўныя моманты дзейнасці ўрада і царквы ў галіне адукацыі, аднабакова разглядалася прававое становішча настаўнікаў, перабольшвалася іх рэвалюцыйная актыўнасць і інш. Многія аспекты, сярод якіх сістэма ніжэйшай педагагічнай адукацыі, грамадскае становішча, правы і абавязкі настаўнікаў, іх побыт, сацыяльнае паходжанне і інш., практычна не закраналася папярэдняй гістарыяграфіяй. Такім чынам, гісторыя вясковай настаўніцкай інтэлігенцыі з'яўляецца маладаследаванай навуковай праблемай, якая не дазваляе цалкам асэнсаваць і напісаць агульную гісторыю народнай асветы.

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта
659ар

Акрамя таго, дадзеная праблема мае і вялікае маральнае значэнне. Яе вырашэнне дазваляе аднавіць у чалавечай памяці імёны тых настаўнікаў, што, нягледзячы на многія цяжкасці і выпрабаванні лёсу, працавалі ў галіне пачатковай народнай адукацыі.

***Сувязь працы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.*** Праблематыка дысертацыі непасрэдна звязана з навуковай дзейнасцю кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта БДУ, з выконваемай НДР "Трансфармацыя сацыяльнай структуры насельніцтва Беларусі ва ўмовах станаўлення індустрыяльнага грамадства (сярэдзіна XIX – пачатак XX стст.)" (НДР-735, № 20011918). Тэма дадзенага даследавання зацверджана на Вучоным Савеце гістарычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта (пратакол № 5 ад 28 студзеня 1998 г.), удакладнена 21 кастрычніка 2003 г. (пратакол № 2).

***Мэта і задачы даследавання.*** Мэтай дысертацыйнага даследавання з'яўляецца комплекснае вывучэнне жыцця і дзейнасці вясковай настаўніцкай інтэлігенцыі Беларусі, яе ролі і месца ў грамадстве другой паловы XIX –пачатку XX стст.

Для дасягнення пастаўленай мэты вызначаны наступныя задачы :

- разгледзець станаўленне і развіццё сістэмы сярэдняй і ніжэйшай педагагічнай адукацыі і яе асаблівасці;
- ахарактарызаваць асноўныя кірункі палітыкі царскага ўрада ў адносінах да вясковага настаўніцтва Беларусі, вызначыць яе спецыфічныя рысы;
- прааналізаваць дзейнасць урада ў афармленні прававога статусу вясковай настаўніцкай інтэлігенцыі, ступень яе сацыяльнай абароненасці і становішча ў грамадстве;
- даследаваць адукацыйны, сацыяльны, нацыянальны, палавы і ўзроставы склад настаўнікаў, вызначыць сярэдні тэрмін іх службы і адносіны да яе;
- прасачыць узровень матэрыяльнага становішча, дынаміку і асноўныя шляхі яго паляпшэння;
- выявіць прычыны ўзнікнення педагагічных таварыстваў і паказаць асноўныя кірункі іх дзейнасці.

***Аб'ект і прадмет даследавання.*** Аб'ектам даследавання з'яўляецца гісторыя народнай асветы Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стст. Прадметам – падрыхтоўка, прававое, матэрыяльнае і сацыяльнае становішча вясковай настаўніцкай інтэлігенцыі Беларусі, а таксама асаблівасці дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да яе.

Хроналагічныя рамкі даследавання ахопліваюць перыяд з пачатку 60-х гадоў XIX ст. да лютага 1917 г. Дата ніжняй мяжы вызначаецца часам пачатку правядзення адукацыйнай рэформы 1863 г. у Паўночна-Заходнім краі. Верхняя мяжа звязана з падзеннем самаўладдзя ў Расіі ў лютым 1917 г.

***Метадалогія і метады праведзенага даследавання.*** Пры напісанні дысертацыі аўтар кіравалася прынцыпамі гістарызму, аб'ектыўнасці і сістэмнасці ў вывучэнні гістарычных матэрыялаў. Вызначаючы метадалогію даследавання, за аснову браліся працы вядомых дарэвалюцыйных, савецкіх і сучасных гісторыкаў, якія тычыліся тэмы развіцця народнай асветы на Беларусі. Выкарыстоўваліся гісторыка-генетычны, апісальны, параўнальна-гістарычны, матэматычна-статыстычны метады і метад каштоўнаснага падыходу. Важная роля належыць такім агульнанавуковым метадам, як індукцыя, дэдукцыя, аналіз і сінтэз.

***Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.*** Дысертацыйная праца з'яўляецца першым комплексным даследаваннем гісторыі вясковага настаўніцтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст. Аўтар выявіла, сістэматызавала і абагульніла архіўны і апублікаваны матэрыял па разглядаемай праблеме. Упершыню вывучаецца жыццё і дзейнасць вясковага настаўніцтва як часткі педагагічнай інтэлігенцыі Расіі, яго фарміраванне як сацыяльнай групы. Аўтарам ахарактарызаваны асноўныя кірункі палітыкі царскага ўрада і вызначаны яе асаблівасці ў адносінах да гэтай часткі настаўніцтва. На аснове аналізу архіўных крыніц і заканадаўчых актаў Расійскай імперыі ўсебакова раскрыта прававое і матэрыяльнае становішча настаўніцтва. Прынцыпова новай з'яўляецца выснова аб існаванні мэтанакіраванай палітыкі ўрада ў вызначэнні статусу вясковага настаўніцтва, яго становішча ў сацыяльнай іерархіі. Комплексна даследавана сістэма педагагічнай падрыхтоўкі, вызначана роля ніжэйшых педагагічных навучальных устаноў, прааналізавана дзейнасць педагагічных таварыстваў узаемадапамогі. Палажэнні і вынікі праведзенага даследавання дазваляюць з сучасных навуковых пазіцый асэнсаваць і значна паглыбіць нашы ўяўленні аб ролі вясковага настаўніцтва ў грамадскім жыцці Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стст.

Упершыню ў навуковы ўжытак уведзены значны масіў архіўных матэрыялаў, які ўзбагачае веданне ў цэлым гісторыі Беларусі.

***Практычная і сацыяльная значнасць атрыманых вынікаў.*** Дысертацыйная праца дазваляе ў пекаторай ступені запоўніць існуючыя "белыя плямы" ў гісторыі народнай асветы і сацыяльнай структуры грамадства, дае магчымасць па-новаму паглядзець на праблему прафесійнага адбору і падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў. Матэрыялы, высновы і палажэнні даследавання могуць быць выкарыстаны пры напісанні абагульняючых прац па гісторыі Беларусі, для падрыхтоўкі падручнікаў, метадычных дапаможнікаў, лекцый і спецкурсаў для студэнтаў педагагічных навучальных устаноў, у краязнаўчай рабоце. Значнасць атрыманых вынікаў вызначаецца таксама магчымасцю іх выкарыстання ў працэсе рэфармавання школы, пры вызначэнні статусу настаўніка ў сучаснай сістэме адукацыі.

***Асноўныя палажэнні, што выносяцца на абарону :***

1. Другая палова XIX – пачатак XX стст. – перыяд станаўлення і развіцця сістэмы педагагічнай адукацыі на Беларусі. Сярэднія дзяржаўныя педагагічныя навучальныя ўстановы, нягледзячы на недахопы ў навукова-тэарэтычнай і спецыяльна-прафесійнай падрыхтоўцы, выпускалі дастаткова падрыхтаваных кандыдатаў на настаўніцкія пасады. Ніжэйшыя педагагічныя навучальныя ўстановы, да якіх адносіліся другакласныя, царкоўна-настаўніцкія школы і кароткатэрміновыя педагагічныя курсы, унеслі значны ўклад у пашырэнне колькаснага складу настаўніцтва. На большасць кароткачасовых педагагічных курсаў была ўскладзена непасільная роля спецыяльнай падрыхтоўкі. Колькаснае, а не якаснае павелічэнне настаўніцкіх кадраў забяспечвала сістэма педагагічнага экстэрната.

2. Урадавая адукацыйная палітыка на Беларусі вызначалася дваістасцю, непаслядоўнасцю і большай рэакцыйнасцю ў параўнанні з іншымі губернямі Расійскай імперыі. У руках царскага ўрада адукацыя з'яўлялася сродкам сацыяльнага рэгулявання і кантролю. Фарміравалася мадэль "ідэальнага" працаўніка пачатковай школы, адданага царкве, прастолу, талерантнага, непрыкметнага і паслухмянага, які ў працэсе сваёй педагагічнай дзейнасці павінен быў праводзіць афіцыйны курс і апірацца на такія сацыяльна-палітычныя і духоўныя каштоўнасці, як самаўладдзе, праваслаўе, народнасць.

3. Тагачасная заканадаўча-нарматыўная база вызначыла прававы статус вясковага настаўніка як дзяржаўнага служачага 14 класа. Яго асоба знаходзілася пад пільным кантролем з боку дырэкцый, інспекцый, мясцовай паліцыі, святароў, членаў валасных праўленняў. Аднак на практыцы сфарміраваліся два тыпы настаўніка: слугі ўлады і апоры кансерватыўнай ідэалогіі, і новага, незалежнага чалавека з перадавымі сацыяльна-палітычнымі і педагагічнымі поглядамі.

4. Вясковае настаўніцтва, якое складала значную частку інтэлігенцыі Беларусі, характарызавалася маладым узростам і недастатковым узроўнем педагагічнай адукацыі. Адбывалася скарачэнне колькасці настаўнікаў, выхадцаў з дваранаў і духавенства, і павелічэнне з ліку сялян і мяшчан. Назіралася тэндэнцыя росту жанчын-педагогаў у агульнай масе настаўнікаў, якія ў асноўным лічылі сябе рускімі і праваслаўнымі. Для большасці з іх выкладанне з'яўлялася часовым заняткам.

5. Матэрыяльны ўзровень, які забяспечваў самыя мінімальныя патрабаванні, быў вызначальным прынцыпам пры ўкамплектаванні пачатковых школ настаўніцкімі кадрамі. Адсутнічала адзіная сістэма заработнай платы, якая з'яўлялася галоўным крытэрыем матэрыяльнага дабрабыту. Большасць настаўнікаў атрымлівалі абмежаваную зарплату, якая вагалася і залежала ў асноўным ад рашэнняў валасных сходаў. Шляхі паляпшэння жыццёвага ўзроўню былі абмежаванымі і выкарыстоўваліся толькі нязначнай часткай настаўнікаў.

6. Стварэнне педагагічных таварыстваў узаемадапамогі было важнейшай праявай грамадска-педагагічнага руху. Яны сталі першай формай прафесійнай арганізацыі народных настаўнікаў і адыгралі пэўную станоўчую ролю ва ўздыме матэрыяльнага становішча і сацыяльнага статусу народнага настаўніка. Асноўнымі кірункамі дзейнасці суполак з’яўліся: выдача грашовых дапамог, адкрыццё інтэрнатаў для настаўніцкіх дзяцей і выданне педагагічных часопісаў.

***Асабісты ўклад суіскальніка.*** Дысертацыя з’яўляецца самастойным навуковым даследаваннем. Аўтарам праведзена праца па выяўленні, зборы, сістэматызацыі і аналізе дакументаў і матэрыялаў. Крытычна асэнсаваны матэрыял апублікаваных крыніц і навуковай літаратуры.

***Апрабацыя вынікаў дысертацыі.*** Асноўныя палажэнні дысертацыйнага даследавання абмяркоўваліся на пасяджэннях кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу БДУ. Вынікі працы паведамляліся на навукова-практычнай канферэнцыі БДПУ “Гісторыя Беларусі: новае ў даследванні і выкладанні” (27 сакавіка 1999 г., г. Мінск) і канферэнцыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі “Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: стан і перспектывы развіцця” (6 – 7 кастрычніка 1999 г., г. Мінск).

***Апублікаванасць вынікаў.*** Па тэме дысертацыі апублікавана 9 навуковых прац, у тым ліку 7 артыкулаў у навуковых часопісах, зборніках і энцыклапедыі, 2 – у матэрыялах канферэнцый. Агульны аб’ём публікацый складае 31 старонку.

***Структура і аб’ём дысертацыі.*** Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, спісу выкарыстаных крыніц і дадаткаў. Поўны аб’ём дысертацыі складае 134 старонкі, з іх спіс выкарыстаных крыніц – 17 старонак, дадаткі – 9 старонак. Спіс выкарыстаных крыніц уключае 319 назваў.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва ***“Уводзінах”*** даецца ацэнка сучаснага стану праблемы, прыведзена абгрунтаванне неабходнасці яе вывучэння і вызначана кола пытанняў, патрабуючых навуковага даследавання.

У ***“Агульнай характарыстыцы работы”*** раскрываецца актуальнасць тэмы дысертацыі, вызначаюцца яе мэта і задачы, аб’ект і прадмет даследавання, сувязь з навуковымі праграмамі, метадалогія і метады яе правядзення. Вызначаюцца навуковая навізна і практычная значнасць атрыманых вынікаў, фармулююцца асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону. Адзначаецца асабісты ўклад суіскальніка, апрабацыя вынікаў дысертацыі, колькасць апублікаваных работ, структура і аб’ём дысертацыі.

У першай главе ***“Гістарыяграфія і крыніцы”*** даецца гістарыяграфічны аналіз вывучаемай праблемы і выкарыстанай крыніцазнаўчай базы.

Першыя крокі ў асэнсаванні і вывучэнні развіцця пачатковай адукацыі і становішча народнага настаўніцтва ў беларускіх губернях Расіі зрабілі тагачасныя даследчыкі – сучаснікі і сведкі падзей. Гэта былі нешматлікія працы, якія вылучаліся афіцыёзнасцю і мелі ў асноўным апісальны характар. Храналагічная іх большасць прыходзіцца на 1890-я – 1910-я гг. (даследаванні А. Мілавідава[1], А. Бялецкага[2], І. Карнілава[3], С. Раждзественскага[4], М.В. Чэхава[5], Г. Фальбарка і В. Чарналуцкага[6] і інш.). Да пытанняў прафесійнай падрыхтоўкі настаўнікаў звярталіся В. Золатаў, В. Грыгор'еў, С. Мірапольскі, П. Саламацін, А. Тарнаўскі, А. Ярушэвіч[7], Г. Кіпрыяновіч[8] і інш. М. Радзевіч[9] апісаў адносіны сялян да школы і настаўнікаў. Праблемы матэрыяльнага забеспячэння педагогаў узнялі І. Самайловіч[10] і І. Кукушкін[11]. Крытычна ахарактарызаваў дзейнасць міністэрства і інспекцый, іх адносіны і стаўленне да вясковых настаўнікаў Я. Звягінцаў[12]. З такіх жа пазіцый разглядалі палітыку царызму ў галіне школьнай справы ў сваіх літаратурных творах дзеячы беларускага нацыянальнага адраджэння (Я. Колас, Цётка, Я. Лёсік). Некаторыя пытанні развіцця школ духоўнага ведамства і падрыхтоўкі для іх настаўнікаў адлюстроўваюцца ў калектыўных працах: "Исторический очерк развития церковных школ за 1884—1909 гг."[13] і «Народное образование в церковных приходских школах Могилёвской епархии в 1913–14 уч. г.»[14].

На хвалі беларусізацыі 1920-х гадоў праявілася цікавасць да гісторыі нацыянальнай асветы (працы Я. Троська[15] і З. Сцяпура[16]). Дасавецкую сістэму педагагічнай адукацыі, як "неадпаведную нармальным запатрабаванням", крытыкавалі І. Сербаў і А. Цвікевіч. У 1930-я гады дамінуючай стала тэма ўдзелу настаўнікаў у рэвалюцыйнай барацьбе.

---

1 Миловидов А. Деятельность графа М.Н. Муравьёва по народному просвещению в Северо-Западном крае (1863-65). – Харьков: Тип. Губернского правления, 1900. – 100 с.

2 Белецкий А.В. Сороколетие русской начальной школы в Северо-Западном крае России. – Вильна: Тип. А.Г. Сыркина, 1905. – 64 с.

3 Корнилов И.П. Памяти графа Михаила Николаевича Муравьёва. К истории Виленского учебного округа за 1863-1868 гг. – СПб., 1898. – 47 с.; Корнилов И. Русское дело в Северо-Западном крае. Материалы по истории Виленского учебного округа преимущественно в Муравьёвскую эпоху. – С-Петербург: Тип. А. Суворина, 1908. – Вып. 1. – 504 с.

4 Рождественский С.В. Исторический обзор деятельности Министерства Народного Просвещения. 1802-1902. – СПб.: Тип. А.В. Арлова, 1902. – 579 с.

5 Чехов Н.В. Народное образование в России с 60-ых годов XIX века. – М.: Польза, 1912. – 224 с.

6 Фальборк Г., Чарнолуский В. Народное образование в России. Исторический очерк. – СПб.: Изд-во Попова, Б.г.- 264с.

7 Ярушевич А. Молодечно и его учебные заведения: К пятидесятилетию Молодечненской учительской семинарии. 1864-1914. – Вильна: Русский Почин, 1914. – 70 с.

8 Киприанович Г.Я. К истории женского образования в западной России.—Вильна: Губернская тип., 1910—69 с.

9 Родевич М. Белорусские народные школы. – Б.м., Б.г. – 119 с.

10 Самойлович И.А. Экономическое значение народного образования; положение последнего и его нужды в Витебской губерни. – Витебск: Губернская типография, 1903. – 82 с.

11 Кукушкин И.П. Последнее десятилетие в истории Витебской Дирекции народных училищ (1891-1901). – Витебск: Губернская типо-литография, 1904. – 59 с.

12 Звягинцев Е.А. Инспекция народных училищ. М.: Тип. О.Л. Сомовой, 1914. – 132 с.

13 Исторический очерк развития церковных школ за истёкшее двадцатипятилетие (1884-1909). – СПб.: Синодальная типография, 1909. – 686 с.

14 Народное образование в церковно-приходских школах Могилёвской епархии в 1913/14 уч. г. – Могилёв: Тим. И.Б. Клаза и М.Л. Кагана, 1915. – 111 с.

15 Троська Я. Некаторыя моманты з дарэвалюцыйнае асьветы на тэрыторыі сучаснае Магілёўшчыны // Полымя. – 1926. -- № 1. – С. 128-141.

16 Сцяпура З. Стан народнай асьветы на Беларусі да вайны 1914 года // Асвета. – 1926. -- №7. – С. 92-98; Сьцяпура З. Кароткі гістарычны нарыс сыстэмы народнай асьветы // Асьвета. – 1927. -- №4.—С. 3-30.

У пасляваенны перыяд савецкая гістарыяграфія ў цэлым, так і беларуская ў прыватнасці, не здолела пазбавіцца схематызму ў ацэнках падзей. У працах М. Канстанцінава і В. Струмінскага[17] разглядаецца арганізацыя школьнай справы, адносіны ўрада да апазіцыйна настроеных настаўнікаў. Значны крок у даследаванні педагагічнай асветы зрабіў А.І. Краўцоў[18]. Па гісторыі пачатковай школы Беларусі абаранілі кандыдацкія дысертацыі М.К. Кірылаў[19] і П.С. Іванчанка[20]. З 1960-х гг. назіраецца пашырэнне тэматыкі. Так, І. Ільюшын і С. Умрэйка[21] прааналізавалі матэрыяльнае становішча настаўнікаў розных катэгорый. С. Лузгіна[22] ўзняла праблему ўзнікнення і развіцця педагагічнага друку ў Беларусі. Значнай падзеяй стаў выхад калектыўных прац "Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі"[23] і "Очерки истории школы и педагогической мысли народов СССР"[24]. Дзейнасць настаўніцкіх семінарый разглядалі Г. Сянкевіч і А. Трухан[25], Н.В. Каменская, Я.К. Новік. Гісторыю настаўніцтва, як часткі расійскай інтэлігенцыі, упершыню як асобную праблему паставіла В. Лейкіна-Свірская[26]. М.С. Мяцельскі[27] і Ф.Г. Паначын зрабілі выснову аб абмежаванні рэвалюцыйнай дзейнасці настаўнікаў праблемамі школы. Каштоўным здабыткам стала выданне ў 1985 г. новай абагульняючай працы "Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г."[28]. Але тагачасныя сацыяльна-палітычныя абставіны не дазволілі адысці ад афіцыйнай парадыгмы. Доўгі час па ідэалагічных матывах не праводзілася даследаванне царкоўнай адукацыі.

Спроба новых падыходаў да вывучэння гісторыі вясковага настаўніцтва Беларусі была зроблена напрыканцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. У рэчышчы агульных тэндэнцый развіцця гістарыяграфіі адбывалася пераасэнсаванне дакументальнага матэрыялу і пошук новай праблематыкі. Значны ўклад у вывучэнне пытанняў педагагічнай падрыхтоўкі настаўнікаў зрабіў

---

[17] Константинов Н.А., Струминский В.Я. Очерки по истории начального образования в России. – М.: Учпедгиз, 1953. - 272с.

[18] Кравцов А.И. Педагогическое образование в Белоруссии в дооктябрьский период // Учёные записки Минского государственного педагогического института иностранных языков. Сер. педагогическая. – Мн.: Госуд. уч.-пед. изд.-во Министерства Просвещения БССР, 1958. – Вып. 1. – С. 3-63.

[19] Кириллов М.К. Очерки по истории начальной школы Белоруссии в XIX и XX в. (с начала XIX в. до 1917 г.): Автореф. дисс… канд. пед. наук. – М., 1950. – 23 с.

[20] Иващенко П.С. Начальная народная школа в Белоруссии с конца XIX в.: До Великой Октябрьской социалистической революции. Автореф. дисс…. канд. пед. наук. – М., 1953. – 15 с.

[21] Ильюшин И. Умрейко С. Народное образование в Белорусской ССР. – Мн.: Госуд. уч.-пед. изд.-во Министерства Просвещения БССР, 1961. – 438 с.

[22] Лузгіна С. Пытанні народнай асветы у першых легальных газетах Беларусі // Народная асвета. – 1970. -- №10. – С.84-88; Лузгіна С. Узнікненне і развіццё педагагічнага друку у Беларусі // Народная асвета. – 1969. -- №9. – С. 81-85.

[23] Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі / Пад. рэд. С. Умрэйкі, Г.Р. Сянкевіча, У.К. Андрэенкі. – Мн.: Народная асвета, 1968. – 622 с.

[24] Очерки истории школы и педагогической мысли народов СССР: Вторая половина XIX века. Под общ. ред. А.И. Пискунова. – М.: Педагогика. – 1976. – 599 с.

[25] Сянькевіч Г.Р., Трухан А.В. Полацкая настаўніцкая семінарыя // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1978. -- №3. – С.28-30; Сянькевіч Г.Р., Трухан А.В. Рагачоўская настаўніцкая семінарыя // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1981. -- №2. – С.26-28; Сянькевіч Г.Р. Настаўніцкія семінарыі ў Беларусі // Народная асвета. – 1983. – №7. – С. 66 – 69.

[26] Лейкина-Свирская В.Р. Интеллигенция в России во второй половине XIX века. – М.: Мысль, 1971. – 368с.

[27] Мяцельскі М.С. Народнае настаўніцтва Беларусі у перыяд рэвалюцыі 1905-1907 гадоў // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У.І. Леніна. Сер. 4. – 1981. – №11. – С. 46-49.

[28] Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. / М.А. Ткачоў, У.С. Пасэ, Г.Р. Сянькевіч і інш.; Пад рэд. М.А. Лазарука.– Мн.: Народная асвета, 1985. – 464 с.

В.М. Лухверчык[29], які ў 1994 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю “Станаўленне і развіццё сярэдняй педагагічнай адукацыі ў дарэвалюцыйнай Беларусі (2 п. XIX – пач. XX ст.)”.

У 1992 г. М.С. Мяцельскі[30] апублікаваў артыкул аб ролі земстваў у справе асветы. Пэўныя крокі былі зроблены ў вывучэнні царкоўнай адукацыі. В.В. Яноўская, А.Ф. Смалянчук, С.В. Васовіч[31] разглядаюць народную адукацыю як важны сродак умацавання пазіцый праваслаўнай і каталіцкай цэркваў у Беларусі. У артыкулах сучасных даследчыкаў Т.А. Шаронавай, О.І. Яршовай, І.П. Дзялендзік, Л.М. Лыча, А.М. Байлуковай, У.Я. Казлякова, Е.Г. Андрэевай, Н. Матусевіч[32], А.І. Багдановіча і інш. вылучаны асноўныя тэндэнцыі ў развіцці народнай адукацыі, закрануты пытанні падрыхтоўкі і становішча настаўнікаў, педагагічнага руху, ролі інспекцый народных вучылішчаў, вывучаецца колькасць і склад інтэлігенцыі Расіі, яе дзейнасць і грамадскія арганізацыі.

Асаблівае месца ў айчыннай гістарыяграфіі займаюць працы С.В. Снапкоўскай, аўтара дзвюх манаграфій[33], шэрагу артыкулаў па праблеме. У 1992 г. яна абараніла кандыдацкую дысертацыю “Грамадска-педагагічны рух і педагагічная думка ў Беларусі (90 гг. XIX ст. – 1917 г.)”, а ў 1999 г. доктарскую “Адукацыйная палітыка царызму і педагагічная думка ў Беларусі (60-ыя гг. XIXст. – 1917 г.)”. С.В. Снапкоўская з сучасных навуковых пазіцый даследуе стан, асноўныя кірункі і тэндэнцыі развіцця школы і педагагічнай думкі, раскрывае ідэалагічныя асновы школьнай палітыкі і шляхі яе рэалізацыі ў Беларусі, аналізуе праблему нацыянальнай школы ў цеснай сувязі з працэсам адраджэння, уводзіць у навуковы зварот новыя архіўныя матэрыялы.

Пытанні гісторыі народнай асветы знаходзяць адлюстраванне і ў сучаснай расійскай гістарыяграфіі. Пэўную цікавасць уяўляюць працы Э.Д. Днярова, М.І. Анісава, С.Ф. Ягорава, А.М. Цырульнікава, В.І. Сучкова[34], Б.К. Цыбіева і інш., у якіх аўтары разглядаюць асноўныя кірункі сацыяльнай актыўнасці настаўніцтва. Сучасная польская даследчыца І. Матус[35] разглядае арганізацыю навучання ў царкоўна-парафіяльных школах Гродзенскай губерні, Х. Глагоўска звяртае некаторую ўвагу падрыхтоўцы настаўнікаў на акупаванай тэрыторыі падчас першай сусветнай вайны.

---

[29] Лухверчык В.М. Полацкая настаўніцкая семінарыя // Народная асвета.—1986. -- №6. – С. 73-76; Лухверчык В.М. Прыватныя і грамадска-педагагічныя навучальныя установы на Беларусі ў сярэдзіне XIX – пачатку XX ст. // Народная асвета. – 1993. -- №11. – С. 77-80; Лухверчык В.М. Сярэднія педагагічныя навучальныя ўстановы дарэвалюцыйнай Беларусі // Народная асвета. – 2002. -- №1. – С. 67-71.

[30] Мяцельскі М.С. Земствы і школа на Беларусі // Пачатковая школа. – 1992. -- №4. – С.32-36.

[31] Васовіч С.М. Царкоўныя праваслаўныя школы Беларусі (канец XVIII -- пачатак XX ст.) // Адукацыя і выхаванне. – 2001. -- №4. – С. 67-70.

[32] Матусевіч Н. Настаўніцкія семінарыі і іх роля ў адукацыі на Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2001. -- №3. – С.46-49; Матусевіч Н. Прававое і матэрыяльнае становішча настаўнікаў пачатковай школы ў Беларусі у другой палове XIX – пачатку XX ст. // Беларускі гістарычны часопіс. - 2001.-- №1.—С. 53-57.

[33] Снапкоўская С.В. Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі. – Мн.: Народная асвета, 1995. – 129 с.; Снапкоўская С.В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі у канцы XIX – пачатку XX стст. – Мн.: НІА, 1998. – 191 с.

[34] Сучков И.В. Социальный и духовный облик учительства России на рубеже XIX – XX веков // Общественная история. -- 1995.-- №1. – С. 62-67.

[35] Matus Irena. Szkolnictwo cerkiewno-parafialne w powiecie Bielskim pod koniec XIX i na poczatku XX wieku // Bialoruskie Zeszyty Historyzne. – Bialystok, 1994.-- № 2. - S. 48-63.

Аднак, не зменшваючы каштоўнасці ўсёй папярэдняй гістарыяграфіі, неабходна адзначыць адсутнасць спецыяльных даследаванняў па гісторыі вясковага настаўніцтва.

Нераспрацаванасць азначанай тэмы патрабавала шырокага выкарыстання гістарычных крыніц, разнастайных па змесце і характары. У першую чаргу гэта архіўныя матэрыялы, якія захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, Нацыянальным гістарычным архіве ў г. Гродна, Нацыянальным гістарычным архіве Мінскай вобласці, Беларускім Дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, Мінскім абласным краязнаўчым музеі ў г. Маладзечна.

У дысертацыі выкарыстоўваюцца заканадаўчыя акты Расійскай імперыі. Важнае значэнне маюць матэрыялы афіцыйнага справаводства. Асобае месца сярод іх займаюць цыркуляры, інструкцыі, вучэбныя праграмы, прадпісанні дырэкцый, данясенні, прашэнні настаўнікаў, рапарты, даклады інспектараў і дырэктараў народных вучылішчаў, хадайніцтвы аб назначэнні прэмій і дапамог, ганаровых узнагарод настаўнікам, дазволе на педагагічныя з'езды.

Багаты і разнастайны матэрыял змяшчаецца ў перыядычным друку: афіцыйных часопісах ("Циркуляр по Виленскому учебному округу", "Народное образование в Виленском учебном округе"), часопісах настаўніцкіх таварыстваў узаемадапамогі ("Белорусский учительский вестник", "Голос учителя", "Белорусский учитель" і "Педагогическое дело"), газетах "Наша ніва", "Наша доля", "Губернские ведомости", "Епархиальные ведомости".

Каштоўнай крыніцай з'яўляюцца статыстычная матэрыялы: "Аднадзённы перапіс пачатковых школ у імперыі, праведзены 18 студзеня 1911г.", "Справаздачы аб стане навучальных устаноў Віленскай навучальнай акругі", "Памятныя кніжкі дырэкцый народных вучылішчаў", справаздачы дырэкцый і Епархіяльных вучылішчных саветаў, педагагічных таварыстваў.

Значны матэрыял утрымліваецца ў крыніцах асабістага паходжання: В.К. "Тяжёлая доля. Отрывки из дневника сельской учительницы, работавшей в Белоруссии", "Записки сельской учительницы" А.А. Штэвен, успамінах І. Кузьміна, Я. Коласа, І.Д. Гарбачэўскага і інш.

У другой главе ***"Падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў для пачатковых школ Беларусі"*** разглядаецца станаўленне і развіццё сістэмы педагагічнай адукацыі, яе эвалюцыя на працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст.

У першым параграфе *"Станаўленне сістэмы сярэдніх педагагічных навучальных устаноў"* падкрэсліваецца, што развіццё капіталізму і новыя грамадска-эканамічныя адносіны, выкліканыя адменай прыгоннага права, далі штуршок для больш шырокага развіцця народнай асветы. Школьная рэформа 1860-х гадоў непазбежна вылучала праблему настаўніцкіх кадраў. Ініцыятыву адкрыцця педагагічных навучальных устаноў, кіруючыся палітычнымі матывамі, ад прыватных асоб пераняў царскі ўрад.

З мэтай падрыхтоўкі "рускіх настаўнікаў як праваднікоў і абаронцаў рускай народнасці" адкрываюцца Маладзечненская (1864 г.), Полацкая

(1872 г.), Нясвіжская (1875 г.), Свіслацкая (1876 г.) і інш. настаўніцкія семінарыі. У працы паказана абмежаванасць і недасканаласць вучэбных планаў і праграм, нягледзячы на паступовае павелічэнне тэрміна навучання ад двух да чатырох гадоў. Разглядаецца узровень паспяховасці, матэрыяльна-тэхнічная база, характарызуецца выкладчыцкі корпус, сацыяльны склад выхаванцаў, іх побытавыя умовы. Аўтар звяртае ўвагу на асноўныя прынцыпы вучэбна-выхаваўчай працы і яе недахопы. Разам з тым, робіцца выснова, што семінарыі былі найбольш эфектыўнымі тыпамі педагагічных навучальных устаноў, давалі спецыяльную адукацыю і даволі ўстойлівыя навыкі прафесіі педагога.

У пачатку XX ст. пачынаюць працаваць адна- і двухгадовыя педагагічныя курсы пры гарадскіх вучылішчах і восьмыя педагагічныя класы жаночых гімназій як больш танны і хуткі спосаб падрыхтоўкі настаўнікаў. Дадзена характарыстыка сістэме курсавой падрыхтоўкі, адзначаны адсутнасць адзіных планаў і праграм, нізкі ўзровень ведаў з прычыны кароткага тэрміна навучання і абмежавання матэрыяльных сродкаў на арганізацыю заняткаў. Але пры недахопе колькасці семінарый, педагагічныя курсы з'яўляліся ўстановай не толькі пажаданай, але і неабходнай. Больш высокі тэарытычны ўзровень ведаў адрозніваў выпускніц гімназій ад выхаванцаў семінарый і курсаў. Але недастатковая колькасць заняткаў па спецыяльна-прафесійных прадметах ператварала кандыдатак на настаўніцкія пасады хоць і ў высокаадукаваных, але метадычна слаба падрыхтаваных спецыялістаў да практычнай дзейнасці.

У другім параграфе *"Ніжэйшыя педагагічныя навучальныя ўстановы"* разглядаецца месца і роля навучальных устаноў духоўнага ведамства (другакласных і царкоўна-настаўніцкіх школ), якія адкрываліся згодна "Палажэнню аб царкоўных школах ведамства праваслаўнага веравызнання" 1902 г., і кароткатэрміновых курсаў. Ад сярэдніх педагагічных устаноў яны адрозніваліся ніжэйшым узроўнем агульнатэарытычнай і практычнай падрыхтоўкі. Сярод іх больш прыстасаванымі для патрэб народнай адукацыі былі царкоўна-настаўніцкія школы (Барунская, Чырвонастоцкая) з трохгадовым тэрмінам навучання. Кароткатэрміновыя курсы з мэтай павышэння кваліфікацыі штогод арганізоўваліся пры семінарыях, сельскагаспадарчых школах. Павялічвала колькасць кандыдатаў на настаўніцкія пасады і сістэма педагагічнага экстэрната. Але рост, які не забяспечваў адпаведнай педагагічнай адукацыі, не азначаў якасных змен у падрыхтоўцы будучых выкладчыкаў.

У 1916 г. у Беларусі працавалі: 9 настаўніцкіх семінарый (каля 1000 навучэнцаў), 7 двухгадовых педагагічных курсаў (288 чалавек), 7 педагагічных класаў пры жаночых гімназіях ( 250 вучаніц), 20 другакласных настаўніцкіх школ ( 1420 чалавек), 2 царкоўна-настаўніцкія школы (каля 80 чалавек).

У трэцяй главе ***«Дзяржаўная палітыка ў адносінах да вясковай настаўніцкай інтэлігенцыі і яе прававы статус"*** вызначаны асноўныя асаблівасці палітыкі царскага ўрада ў дачыненні да вясковага настаўніцтва, ахарактарызавана яго прававое і сацыяльнае становішча.

У першым параграфе *«Адукацыйная рэформа і палітыка царызму ў дачыненні да вясковых настаўнікаў»* аналізуюцца школьная рэформа і кірункі

дзяржаўнай адукацыйнай палітыкі ў адносінах да вясковай настаўніцкай інтэлігенцыі. Паказана, што правядзенне адукацыйнай рэформы на Беларусі з некаторымі асаблівасцямі было абумоўлена сялянскім рухам і паўстаннем 1863 г. На першым плане стаялі мэты палітычныя, а асветніцкія адсоўваліся на другі. 23 сакавіка 1863 г. прыняты «Часовыя правілы для народных школ у губернях: Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай», якія дзейнічалі да канца XIX ст. Ствараліся дырэкцыі народных вучылішчаў, вучылішчныя саветы і ўводзіўся штат інспектараў. Вялікую ролю рэформа адводзіла праваслаўным святарам, якія назіралі за рэлігійным і маральным кірункам вучылішчаў і іх выкладчыкаў.

Аўтарам паказаны асноўныя падыходы Міністэрства народнай асветы ў вырашэнні кадравага пытання. На пасады настаўнікаў прызначалі мясцовых праваслаўных святароў, запрашалі выкладчыкаў з цэнтральных расійскіх губерняў, звальнялі палякаў, выказваўся недавер асобам беларускага, літоўскага, яўрэйскага паходжання. Актыўна вялася барацьба з «тайным навучаннем», назіралася ўзмацненне кантролю з боку ўрада за падрыхтоўкай у настаўніцкіх семінарыях, школамі і настаўнікамі. Школа выкарыстоўвалася як сродак русіфікацыі края і барацьбы з «пальшчызнай». У афіцыйных дакументах і працах ахоўна-прапагандысцкай скіраванасці падкрэслівалася, што асноўная задача настаўнікаў – правядзенне дзяржаўнага курсу ў працэсе сваёй прафесійнай дзейнасці шляхам выканання строга фіксаваных функцыянальных абавязкаў. Палітыка ўрада была накіравана на фарміраванне адпаведнага “ідэальнага” працаўніка – талерантнага, сціпага, непрыкметнага, адданага царкве і царскаму прастолу.

Выдадзеныя заканадаўчыя акты і цыркуляры міністэрства сведчылі аб наступленні рэакцыі ў сферы народнай адукацыі. Адукацыйная палітыка была скіравана на пашырэнне сеткі царкоўных школ, устанаўленне строгага нагляду за дзейнасцю настаўнікаў і іх палітычнай добранадзейнасцю. Фінансавыя пытанні, у тым ліку і матэрыяльнае забеспячэнне выкладчыкаў, урад імкнуўся вырашыць за кошт самога народа і земскіх устаноў. Самаўладдзе прыклала шмат намаганняў, каб зрабіць настаўніка «казённай прыладай у выкананні казённых загадаў», але поўнасцю гэтай мэты яму дасягнуць не ўдалося.

У другім параграфе *«Прававое становішча вясковай настаўніцкай інтэлігенцыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст.»* на аснове аналізу законаў, пастаноў, цыркуляраў, інструкцый і іншых нарматыўных палажэнняў вызначаюцца асноўныя правы, свабоды, абавязкі, дадатковыя льготы і перавагі педагогаў.

У працы вывучана дзейнасць дзяржавы ў вызначэнні прававога статусу вясковага настаўніцтва, яго становішча ў сацыяльнай іерархіі. У 1863 г. настаўнікі вызваляюцца ад цялесных пакаранняў, у 1870 г. – ад усіх натуральных павіннасцяў. Паводле «Закону аб вайсковай павіннасці» (1870 г.) яны карысталіся льготай на ўвесь час навучання і працы. Па «Палажэнню аб відах на жыхарства» педагогі атрымлівалі бестэрміновыя пашпартныя кніжкі,

захоўвалі права стану і маёмасці, якія належалі ім па паходжанні. З 1 студзеня 1910 г. усе настаўнікі прыцягваліся да абавязковага ўдзелу ў зацверджанай 12 чэрвеня 1900 г. пенсіённай касе выкладчыкаў міністэрскіх пачатковых навучальных устаноў. Настаўнікі мелі права на адпачынак, з'езды, льготы ў выхаванні дзяцей. За высокія поспехі ў працы многія з іх былі прадстаўлены да ганаровых узнагарод (І. Стэцкі, П. Галін, Я. Саковіч, Ф. Драздзецкі і інш).

Выдадзеная ў 1871 г. «Інструкцыя народным настаўнікам Віленскай навучальнай акругі» вызначала асноўныя абавязкі і правілы, якія павінен быў выконваць настаўнік у вучэбна-выхаваўчым працэсе. Інструкцыя рэгулявала і грамадскую дзейнасць педагогаў, вызначаючы межы ў адносінах з сялянамі, членамі валасных праўленняў, святарамі, а таксама паводзіны падчас інспектарскіх рэвізій. На аснове выкарыстання шырокага кола архіўных дакументаў прааналізаваны таксама асаблівасці прававога становішча настаўніц і выкладчыкаў царкоўнапрыходскіх школ.

У чацвёртай главе ***«Сацыяльнае і матэрыяльнае становішча вясковага настаўніцтва»*** разглядаецца фарміраванне настаўніцтва як сацыяльнай групы, узровень яго матэрыяльнага становішча, а таксама прычыны стварэння і дзейнасць педагагічных таварыстваў узаемадапамогі.

У параграфе *«Вясковае настаўніцтва як сацыяльная група»* даецца падрабязная характарыстыка кадравага складу выкладчыкаў пачатковых школ. Настаўнікі сельскіх школ былі, як правіла, слоем, ніжэйшым па кваліфікацыі ў параўнанні з выкладчыкамі гарадскіх навучальных устаноў. У адукацыйным узроўні назіралася вялікая розніца. Спецыяльную адукацыю мелі выхаванцы настаўніцкіх семінарый і педагагічных курсаў, агульную – выпускнікі сярэдніх навучальных устаноў. Адукацыя, ніжэйшая за сярэднюю, была ў тых, хто скончыў другакласныя і царкоўна-настаўніцкія школы, і хто атрымаў пасведчанне на званне настаўніка па экзамену (экстэрнам). Аўтарам вывучаны звесткі аб адукацыйным узроўні настаўнікаў народных вучылішчаў і царкоўных школ. Так, у 1864 г. па Віленскай навучальнай акрузе працавала 571 асоба духоўнага стану і толькі 49 чалавек – свецкія. У пачатку XX ст., напрыклад, па Віцебскай губерні, сярод настаўнікаў былі ўжо: 45% – выпускнікі настаўніцкіх семінарый, 26% – сярэдніх навучальных устаноў. Але ў сувязі з хуткім ростам колькасці пачатковых школ і недахопам педагагічных навучальных устаноў, у спецыяльна падрыхтаваных настаўніках адчуваўся востры недахоп.

У 1880 г. у Беларусі працавала толькі 12,2% настаўніц, у канцы XIX ст. – 30%. Гэта было звязана з практычнай адсутнасцю педагагічных жаночых навучальных устаноў. Разам з тым, назіралася тэндэнцыя павелічэння колькасці выкладчыц, маючых сярэднюю адукацыю. У 1915 г. ва ўсіх пачатковых вучылішчах акругі працавала 4617 мужчын і 4321 жанчына.

Сацыяльны склад вясковага настаўніцтва другой паловы XIX ст. быў у асноўным дробнабуржуазным. У 1880 г. дваране складалі 10,9%, асобы духоўнага стану – 37,8%, сяляне (з заможных сямей) – 30,2%, мяшчане – 10,1%, іншыя – 11%. У пачатку новага стагоддзя скарацілася колькасць

настаўнікаў з дваран і духавенства і павялічылася з сялян і мяшчан (у 1911 г. да 73%). У царкоўнапрыходскіх школах асобы духоўнага стану складалі каля 30%. Да рэвалюцыі 1905-1907 г. забаранялася дапускаць да педагагічнай дзейнасці асоб неправаслаўнай веры. Па нацыянальнасці настаўнікі павінны былі быць рускімі. У 1910 г. выкладчыцкі персанал, напрыклад, Віцебскай губерні складаўся практычна з рускіх – 95,6% і праваслаўных – 97,5%.

Па ўзросту большасць настаўнікаў належыла да моладзі. У 1880 г. сярод мужчын ва ўзросце да 30 гадоў працавала каля 77%, у 1911 – 70%, сярод жанчын – 87% і 81%. Больш чым ¾ усіх выкладчыкаў не знаходзіліся ў шлюбе. Пры цяжкай і матэрыяльна незабяспечваючай працы многія настаўнікі не вытрымлівалі працяглых тэрмінаў службы (сярэдні тэрмін – 5 год). Найбольшая змена кадраў назіралася сярод тых, хто скончыў духоўныя семінарыі. Даўжэй за ўсіх трымаліся выхаванцы настаўніцкіх семінарый, якія мэтанакіравана рыхтаваліся да педагагічнай працы.

У другім параграфе *«Матэрыяльнае становішча вясковага настаўніцтва»* разглядаецца ўзровень матэрыяльнай забяспечанасці настаўнікаў пачатковых школ, аналізуюцца магчымыя шляхі яго паляпшэння.

У працы паказаны рэшткавы прынцып фінансавання народнай асветы (2,03% ад агульнай сумы дзяржаўнага бюджэту, доля пачатковай адукацыі складала 0,7%). Адназначным было становішча вясковага настаўніка, які лічыўся грамадзянскім служачым па Міністэрству народнай асветы. Галоўным крытэрыем матэрыяльнага дабрабыту быў узровень заработнай платы. Як сведчаць дакументы, у пасляреформенны перыяд памер заробка вясковага настаўніка не толькі ў губерні, а ў павеце і нават воласці быў розным і на працягу ўсёй паловы XIX ст. вагаўся ад 150 да 250 руб. У царкоўнапрыходскіх школах атрымлівалі ўсяго 120-200 руб. Гарантаваны заробак мелі выкладчыкі міністэрскіх школ (250-300 руб.). У практыку аплаты настаўніцкай працы шырока ўводзілася натуральная «ссыпка» – збожжам, гароднінай.

У пачатку XX ст. матэрыяльны стан вясковага настаўніцтва пагоршыўся. Аўтар параўноўвае ўзровень заробку батракоў, рабочых прамысловасці, а таксама выкладчыкаў гарадскіх вучылішч, сярэдніх навучальных устаноў, іх калег у некаторых краінах свету. Падрабязна аналізуюцца магчымыя шляхі павышэння ўзроўню матэрыяльнага становішча (выкладанне рамяства, рукадзелля, Закону Божага, асноў сельскай гаспадаркі, падрыхтоўка вучняў да розных іспытаў, грашовыя дапамогі і прэміі за выдатную працу, надзел зямлі).

Дадзена характарыстыка настаўніцкаму бюджэту. У гэтай сувязі разглядаюцца магчымыя выдаткі на харчаванне, адзенне, набытак неабходных рэчываў. Вывучаны ўмовы жыцця і працы настаўнікаў, якія праходзілі ў асноўным у непрыстасаваных памяшканнях з недапушчальнымі санітарна-гігіенічнымі нормамі. Паказана, што з прычыны нізкай зарплаты, дрэннай забяспечанасці старасці і цяжкіх умоў працы настаўнікі ў вялікай колькасці пакідалі службу і пераходзілі ў іншыя ведамствы.

Трэці раздзел *«Таварыствы ўзаемнай дапамогі настаўнікам і настаўніцам народных вучылішчаў» Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стст.»*

прысвечаны вывучэнню прычын стварэння і асноўных накірункаў дзейнасці педагагічных таварystваў узаемадапамогі.

Узнікненне настаўніцкіх суполак разглядаецца як важнейшая праява грамадска-педагагічнага руху, пачатак барацьбы за паляпшэнне матэрыяльнага і сацыяльнага становішча. 27 снежня 1897 г. было створана першае на Беларусі «Таварыства ўзаемнай дапамогі настаўнікам і настаўніцам Віцебскай губерні», якое ўзначаліў дырэктар народных вучылішчаў Д.І. Ціхамiраў. У 1901 г. такія ж таварыствы ўзніклі ў Мінску, Магілёве і Гродне. Яны мелі шматгаліновую сетку. Напрыклад, у Магілёўскім таварыстве ў 1912 г. было 10 павятовых аддзяленняў. Кожнае з таварыстваў мелі свае, але вельмі падобныя статуты з агульнай мэтай: «дапамагаць тым, хто знаходзіцца ў беднасці, вучачым і вучыўшым у сельскіх і гарадскіх (хрысціянскіх) пачатковых вучылішчах грашовымі дапамогамі і іншымі відамі».

Дзейнасць таварыстваў і іх аддзяленняў праяўлялася галоўным чынам у выдачы праўленнямі пазык і назначэнні беззваротных грашовых выдаткаў на выхаванне дзяцей, лячэнне, у сувязі з цяжкім матэрыяльным становішчам, стратай маёмасці і інш. Дапамога у выхаванні дзяцей праяўлялася ў стварэнні для іх у кожным губернскім горадзе інтэрнатаў і выдзяленні стыпендый. Для хворых настаўнікаў было арганізавана лячэнне ў санаторыях (Друскенікі, Есентукі, Мінеральныя Воды) і кумысалячэбніцах Арэнбургскай і Уфімскай губерняў. Адзначана, што пэўная ўвага надавалася задавальненню духоўных патрабаванняў настаўнікаў (ставіліся і вырашаліся пытанні аб стварэнні педагагічных бібліятэк, арганізацыях экскурсій, курсаў, сваіх выдавецтв).

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Комплексны аналіз гісторыі вясковага настаўніцтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. дае падставы зрабіць выснову, што ў справе асветы дзяржава зрабіла важныя дзейсныя крокі: была створана народная школа, сістэма педагагічнай падрыхтоўкі, вызначаны прававы статус настаўнікаў. Разам з тым, сацыяльнае і матэрыяльнае становішча ў значнай ступені не адпавядала тым мэтам і задачам, якія яны былі прызваныя вырашаць. У гэтай сувязі праблема кадравага забеспячэння пачатковых школ на працягу ўсяго разгледжанага перыяду заставалася складанай. Праведзенае даследаванне дазваляе канстатаваць, што :

1. Сістэма народнай адукацыі, якая склалася ў Расійскай імперыі ў сярэдзіне XIX ст., не адпавядала новым грамадска-палітычным і эканамічным адносінам, выкліканым адменай прыгоннага права. Школьная рэформа 1860-х гадоў з усёй вастрынёй вылучала праблему педагагічных кадраў для дзяржаўных і царкоўных пачатковых вучылішчаў. Дзякуючы ініцыятыве перадавой грамадскасці ўпершыню было створана і арганізацыйна афармлена сярэдняе і ніжэйшае звяно сістэмы педагагічнай адукацыі. Сярэднія

педагагічныя навучальныя ўстановы: настаўніцкія семінарыі, педагагічныя курсы і восьмыя педагагічныя класы жаночых гімназій, нягледзячы на недахопы ў навукова-тэарытычнай і спецыяльна-прафесійнай падрыхтоўцы, рыхтавалі дастаткова кваліфікаваных кандыдатаў на настаўніцкія пасады. Ніжэйшыя педагагічныя навучальныя ўстановы, да якіх адносіліся другакласныя і царкоўна-настаўніцкія школы ведамства Св. Сінода, а таксама кароткатэрміновыя педагагічныя курсы, адрозніваліся ніжэйшым узроўнем агульна-тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі. Вучэбна-выхаваўчы працэс ва ўсіх педагагічных навучальных установах быў прасякнуты манархічнымі ідэямі і знаходзіўся пад непасрэдным кантролем дзяржавы і праваслаўнай царквы. Замест пашырэння сеткі настаўніцкіх семінарый з пачатку XX ст. развівалася сістэма паскоранай падрыхтоўкі настаўнікаў шляхам адкрыцця педагагічных курсаў і іспытаў на званне настаўніка. Урад не спяшаўся паскараць развіццё педагагічнай адукацыі. У выніку ні якасна, ні колькасна педагагічныя навучальныя ўстановы не задавальнялі растучыя патрабаванні ў асвеце народа [3].

2. Урадавая адукацыйная палітыка на Беларусі вызначалася дваістасцю, непаслядоўнасцю і большай рэакцыйнасцю ў параўнанні з іншымі губернямі Расійскай імперыі, у многім дыктавалася імкненнем пасля паўстання 1863 г. зменшыць польскі ўплыў і паскорыць русіфікацыю края. Міністэрства народнай асветы клапацілася не столькі аб распаўсюджванні народнай асветы, колькі аб ахове яе "разумнымі абмежаваннямі". У руках царскага ўрада адукацыя з'яўлялася сродкам сацыяльнага рэгулявання і кантролю, што выражалася ў пашырэнні сеткі царкоўнапрыходскіх школ, стрымліванні падрыхтоўкі педагагічных кадраў, устанаўленні строгага нагляду за дзейнасцю настаўнікаў і іх палітычнай добранадзейнасцю. У адпаведнасці са сваімі палітыка-ідэалагічнымі мэтамі, царызм фарміраваў мадэль "ідэальнага" працаўніка пачатковай школы: адданага царкве, прастолу, талерантнага, сціплага, непрыкметнага і паслухмянага, які ў працэсе сваёй педагагічнай дзейнасці павінен быў праводзіць афіцыйны курс. Назіралася тэндэнцыя прыцягнення да выканання настаўніцкіх абавязкаў асоб з цэнтральных губерняў Расіі, якія скончылі духоўныя семінарыі, і праваслаўных святароў [8].

3. Аналіз прававога становішча вясковага настаўніцтва, з аднаго боку, паказвае, што тагачасная заканадаўча-нарматыўная база вызначала прававы статус настаўніка пачатковай школы як дзяржаўнага служачага 14 класа з усімі належнымі яму правамі і абавязкамі, з другога боку, дэманструе поўную залежнасць яго асобы ад дырэкцый народных вучылішчаў, епархіяльных наглядальнікаў, вучылішчных саветаў, мясцовай паліцыі, святароў, членаў валасных упраўленняў і інш., якія лёгка маглі звольніць са школы непажаданых педагогаў. Палажэнні і інструкцыі цвёрда вызначалі і замацоўвалі галоўныя абавязкі выкладчыкаў пачатковых школ. Адначасова яны скоўвалі ініцыятыву настаўнікаў, празмерна рэгламентавалі выкладчыцкую працу, адносіны з вучнямі і іх бацькамі. Існавалі некаторыя адрозненні ў прававым

становішчы выхадцаў з падатных слаёў. Большасць настаўнікаў даражылі службовымі перавагамі і сацыяльным становішчам, станавіліся слугамі ўлады і апорай кансерватыўнай ідэалогіі. Але паралельна фарміраваўся тып новага, незалежнага чалавека, які кіраваўся ідэямі перадавой педагогікі, меў незалежныя сацыяльна-палітычныя погляды і быў звязаны з вызваленчым рухам [4, 6].

4. Вясковае настаўніцтва складала значную частку інтэлігенцыі Беларусі. Малады ўзрост, недастатковы ўзровень адукацыі і кароткачасовасць педагагічнай дзейнасці – асноўныя рысы настаўніцтва другой паловы XIX – пачатку XX стст. Па свайму сацыяльнаму складу яно не было аднародным: у 1860-1890-я гг. пераважаў дробнабуржуазны, на мяжы стагоддзяў адбывалася скарачэнне колькасці настаўнікаў, выхадцаў з дваран і духавенства, і павелічэнне з сялян і мяшчан. У многім гэта тлумачылася імкненнем урада рыхтаваць настаўнікаў – праваднікоў палітыкі самаўладдзя – з ліку тых, да каго б сялянства адносілася б з даверам, як да людзей свайго кола. Паводле Першага ўсерасійскага перапісу насельніцтва 1897 г. толькі 20% настаўнікаў беларускіх губерняў лічылі сябе беларусамі. Нязначная колькасць настаўніц у агульнай масе выкладчыкаў шмат у чым тлумачылася практычнай адсутнасцю ў Віленскай навучальнай акрузе спецыяльных жаночых педагагічных навучальных устаноў. Але, адначасова, з 1880-х гг. пачала назірацца іншая тэндэнцыя – росту колькасці жанчын-педагогаў, маючых сярэднюю адукацыю. У цэлым, на працягу ўсяго разглядаемага перыяду адчуваўся востры недахоп педагагічных кадраў для пачатковых школ Беларусі (у 1915 г. у вучылішчах розных тыпаў працавала 8938 настаўнікаў, але і такой колькасці было недастаткова для імкліва растучых патрэб народнай адукацыі) [9].

5. Рэшткавы прынцып у фінансаванні школы яскрава праявіўся ў мізэрных дзяржаўных выдатках на патрэбы народнай асветы. На працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст. праблема матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння школ і стымулявання настаўніцкай працы заставалася нявырашанай. Матэрыяльны ўзровень забяспечваў самыя мінімальныя патрабаванні. Ён з'яўляўся вызначальным прынцыпам пры ўкамплектаванні пачатковых школ настаўніцкімі кадрамі. У дарэвалюцыйнай Расіі адсутнічала адзіная сістэма заработнай платы. Яе ўзровень быў абмежаваным, пастаянна вагаўся і знаходзіўся ў залежнасці ад рашэнняў сялянскіх валасных сходаў. Акрамя асноўнага заробку ў вясковай школе, існавалі і іншыя шляхі павышэння матэрыяльнага дабрабыту: выкладанне рамяства і рукадзелля, падрыхтоўка вучняў для здачы іспытаў на льготу па воінскай павіннасці і для паступлення ў настаўніцкія семінарыі, атрыманне за выдатную працу заахвочванняў і прэмій, надзел зямлі, гаспадарка і інш. Але яны былі абмежаванымі, залежалі ад мясцовых умоў і выкарыстоўваліся толькі нязначнай часткай вясковага настаўніцтва [2, 7].

6. Важнейшай праявай грамадска-педагагічнага руху настаўніцтва было стварэнне ва ўсіх губернскіх гарадах Беларусі педагагічных таварыстваў

узаемадапамогі. Асноўная дзейнасць настаўніцкіх суполак заключалася ў выдачы грашовых дапамог на лячэнне, выхаванне дзяцей, пры страце маёмасці; адкрыцці інтэрнатаў для настаўніцкіх дзяцей, якія вучыліся ў мясцовых навучальных установах; арганізацыі санаторыяў для хворых выкладчыкаў; у клопаце аб задавальненні духоўных патрэбнасцей сваіх членаў (выданне педагагічных часопісаў, стварэнне перасоўчых бібліятэк, дапамога ў арганізацыі паездак на курсы, з'езды і г.д.). Таварыствы ўзаемадапамогі сталі першай формай прафесійнай арганізацыі народных настаўнікаў. Яны адыгралі станоўчую ролю ва ўздыме матэрыяльнага становішча і сацыяльнага статусу народных настаўнікаў [1, 5].

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

**Артыкулы:**

1. Астрога В.М. "Педагогическое дело" // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Мн., 1999. – Т. 5. – С. 461.
2. Астрога В.М. Матэрыяльны стан вясковага настаўніцтва ў канцы XIX – пачатку XX ст. // Народная асвета. – 2002. – № 8. – С. 57-59.
3. Астрога В.М. "Наша ніва" аб народнай адукацыі на Беларусі напачатку XX стагоддзя // Беларусь у XX стагоддзі. Зб. навук. прац. Вып. 1. – Мн., 2002. – С. 5-8.
4. Астрога В.М. Прававое становішча вясковай настаўніцкай інтэлігенцыі Беларусі (др. пал. XIX – пач. XX стст.) // Веснік БДУ. Сер. 3: Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Эканоміка. Права. – 2003. – № 3. – С. 12-17.
5. Астрога В.М. "Таварыствы ўзаемнай дапамогі настаўнікам і настаўніцам народных вучылішчаў" Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. // Адукацыя і выхаванне. – 2003. – № 6. – С. 75-79.
6. Астрога В.М. Узнагароды за настаўніцкую працу // Беларусь у XX стагоддзі. Зб. навук. прац. Вып. 2. – Мн., 2003. – С. 9-11.
7. Острога В.М. Библиотечно-музейное обеспечение учительского труда // Бібліятэчны свет. – 2003. – № 3. – С. 22-23.

**Матэрыялы канферэнцый:**

8. Астрога В.М. Сяляне і народная школа на Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. // Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні. Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі. – Мн., 1999. – С. 9-11.
9. Астрога В.М. Актуальныя праблемы становішча настаўніцтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.: Гістарыяграфічны аспект // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: стан і перспектывы развіцця. Матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 70-годдзю Інстытута Гісторыі НАН Беларусі. – Мн., 2000. – С. 185-187.

## РЭЗЮМЕ

**Астрога Валянціна Міхайлаўна**

**Вясковае настаўніцтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX стст.**

**Ключавыя словы:** вясковае настаўніцтва, дырэкцыя народных вучылішчаў, Віленская навучальная акруга, настаўніцкія семінарыі, педагагічныя курсы, царкоўна-настаўніцкія школы, пачатковая школа, урадавая адукацыйная палітыка, грамадска-педагагічны рух, сацыяльны статус настаўніцтва, педагагічныя таварыствы ўзаемадапамогі.

**Аб'ект даследавання** – гісторыя народнай асветы Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стст.

**Прадмет даследавання** – падрыхтоўка, прававое, матэрыяльнае і сацыяльнае становішча вясковага настаўніцтва Беларусі, асаблівасці дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да яго.

**Мэта даследавання** – комплекснае вывучэнне ўмоў жыцця і дзейнасці вясковай настаўніцкай інтэлігенцыі Беларусі, яе ролі і месца ў грамадстве другой паловы XIX – пачатку XX стст.

**Метады даследавання.** Тэарытычную аснову даследавання складаюць прынцыпы гістарызму і аб'ектыўнасці ў вывучэнні гістарычных матэрыялаў. Выкарыстаны гісторыка-генетычны, апісальны, параўнальны, сістэмны і статыстычны метады. Важная роля належыць такім агульнанавуковым метадам, як індукцыя, дэдукцыя, аналіз і сінтэз.

**Навуковая навізна.** Упершыню ў беларускай і замежнай гістарыяграфіі даследуецца гісторыя вясковага настаўніцтва Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стст. Вывучаюцца ўмовы жыцця і дзейнасці вясковага настаўніцтва як часткі педагагічнай інтэлігенцыі Расіі, яго фарміраванне як сацыяльнай групы. Комплексна разглядаецца сістэма педагагічнай адукацыі, упершыню вызначаецца роля ніжэйшых педагагічных устаноў. Усебакова разглядаецца прававое і матэрыяльнае становішча педагогаў, вызначаецца іх сацыяльны статус. Аналізуюцца асноўныя накірункі і асаблівасці палітыкі царскага ўрада ў дачыненні да вясковага настаўніцтва. Комплексна вывучаецца дзейнасць педагагічных таварыстваў узаемадапамогі і яе значэнне.

**Тэарытычная значнасць** даследавання заключаецца ў тым, што яно дазваляе ў пэўнай ступені запоўніць прагалы ў гісторыі народнай асветы і сацыяльнай структуры грамадства, дае магчымасць з сучасных навуковых пазіцый разгледзець праблему прафесійнага адбору і падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў. **Практычнае значэнне.** Матэрыялы працы могуць быць выкарыстаны пры напісанні абагульняючых і спецыяльных прац па гісторыі асветы Беларусі, гісторыі педагогікі, для падрыхтоўкі падручнікаў, метадычных дапаможнікаў, лекцый і спецкурсаў, у краязнаўчай рабоце.

# РЕЗЮМЕ

## Острога Валентина Михайловна

## Сельское учительство Беларуси во второй половине XIX – начале XX вв.

**Ключевые слова:** сельское учительство, дирекция народных училищ, Виленский учебный округ, учительские семинарии, педагогические курсы, церковно-учительские школы, начальная школа, правительственная образовательная политика, общественно-педагогическое движение, социальный статус учительства, педагогические общества взаимопомощи.

**Объект исследования** – история народного просвещения Беларуси второй половины XIX – начала XX вв.

**Предмет исследования** – подготовка, правовое, материальное и социальное положение сельского учительства Беларуси, особенности государственной политики по отношению к нему.

**Цель исследования** – комплексное изучение условий жизни и деятельности сельской учительской интеллигенции Беларуси, её роли и места в обществе второй половины XIX – начала XX вв.

**Методы исследования**. Теоретическую основу исследования составляют принципы историзма и объективности в изучении исторических материалов. Использованы историко-генетический, описательный, сравнительный, системный и статистический методы. Важная роль принадлежит таким общенаучным методам, как индукция, дедукция, анализ и синтез.

**Научная новизна**. Впервые в белорусской и иностранной историографии исследуется история сельского учительства Беларуси второй половины XIX – начала XX вв. Изучаются условия жизни и деятельности сельского учительства как части педагогической интеллигенции России, его формирование как социальной группы. Комплексно рассматривается система педагогического образования, впервые определяется роль низших педагогических учреждений. Всесторонне рассматривается правовое и материальное положение педагогов, определяется их социальный статус, анализируются основные направления и особенности политики царского правительства в отношении сельского учительства. Комплексно изучается деятельность педагогических обществ взаимопомощи и её значение.

**Теоретическое значение** исследования заключается в том, что оно позволяет в некоторой степени заполнить пробелы в истории народного просвещения и социальной структуры общества, даёт возможность с современных научных позиций рассмотреть проблему профессионального отбора и подготовки учительских кадров. **Практическое значение.** Материалы работы могут быть использованы при написании обобщающих и специальных работ по истории просвещения Беларуси, истории педагогики, для подготовки учебников, методических пособий, лекций и спецкурсов, в краеведческой работе.

## SUMMARY

Valentina Mihailovna Ostroga

Rural education in Belarus in second half of XIX - beginning of XX centuries.

**Keywords:** rural education, management of national schools, Vilensk educational district, teacher's seminaries, pedagogical courses, church-teacher's schools, elementary school, governmental educational policy, public-pedagogical movement, the social status teacher, pedagogical societies of mutual aid.

**Object of research** - history of national education of Belarus of second half XIX - the beginnings of XX centuries.

**Subject of research** - preparation, legal, material and social status of rural education in Belarus, features of state policy in relation to it.

**Purpose of research** - complex studying of conditions of a life and activity of rural teacher's intelligency of Belarus, its role and a place in a society of second half XIX - the beginnings of XX centuries.

**Methods of research**. The theoretical basis of research is made with principles of a historicism and objectivity in studying historical materials. Historical-genetic, descriptive, comparative, system and statistical methods are used. The important role belongs to such general scientific methods, as an induction, deduction, the analysis and synthesis.

**Scientific novelty**. For the first time in the Belarus and foreign historiography the history of rural teacher's in Belarus in second half XIX - the beginnings of XX centuries is studied. Conditions of a life and activity of rural teachers as parts of pedagogical intelligency of Russia, his formation as social group are studied. The system of pedagogical formation is in a complex considered, the role of the lowest pedagogical establishments for the first time is defined. It is comprehensively considered legal and the financial position of teachers, is defined their social status, the basic directions and features of a policy of the imperial government are analyzed concerning rural teachers. Activity of pedagogical societies of mutual aid and its value is in a complex studied.

**Theoretical value of research** consists that it allows to fill gaps in history of national education and social structure of a society, gives possibility from modern scientific positions to overview a problem of professional selection and preparation of the teacher's staff. **Practical value.** Materials of work can be used for while writing general and special works on history of education of Belarus, history of pedagogics, for preparation of textbooks, methodical grants, lectures and special courses, in study of local lore work.

Падпісана да друку 10.02.2005. Фармат 60×84/16. Папера афсетная. Гарнітура Таймс.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 1,25. Тыраж 100 экз. Зак. 150.

Надрукавана з гатовага арыгінала-макета заказчыка
ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Ліцэнзія на паліграфічную дзейнасць № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6.

